**Назва вучэбнай дысцыпліны:**
**«Стылістыка»**

| | |
|---|---|
| **Код і найменне спецыяльнасці** | 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура |
| **Курс навучання** | 4 |
| **Семестр навучання** | 7 |
| **Колькасць аўдыторных гадзін:** | 48 |
| **Лекцыі** | 24 |
| **Семінарскія заняткі** | |
| **Практычныя заняткі** | 24 |
| **Лабараторныя заняткі** | |
| **Форма прамежкавай атэстацыі (*залік/ дыферэнцыраваны залік/экзамен)*** | залік |
| **Колькасць залікoвых адзінак** | 3 |
| **Кампетэнцыі, якія фарміруюцца** | БПК-21. Улічваць стылістычны патэнцыял фанетычных, лексічных, граматычных, дыскурсіўна-тэкставых парадыгмаў беларускай мовы, яе функцыянальна-стылістычныя і стылявыя разнавіднасці. |

**Кароткі змест вучэбнай дысцыпліны:**

Сярод лінгвістычных дысцыплін, якія выкладаюцца на філалагічных факультэтах ВНУ Рэспублікі Беларусь, “Стылістыка” займае адно з найважнейшых месцаў у сістэме падрыхтоўкі настаўнікаў-філолагаў. Гэта самастойная лінгвістычная дысцыпліна, якая мае свой прадмет вывучэння, метады і прыёмы аналізу. Вучэбная дысцыпліна накіравана на сістэматызацыю набытых ведаў пры вывучэнні лінгвістычных дысцыплін, выпрацоўку навыкаў выпраўляць стылістычныя памылкі вуснага і пісьмовага маўлення, удасканаленне ўмення самастойна ствараць тэксты розных стыляў. Тэарэтычныя і практычныя веды, набытыя студэнтамі пры вывучэнні “Стылістыкі”, маюць важнае значэнне ў прафесійнай падрыхтоўцы настаўніка-філолага: стылістыка вучыць адбіраць з усяго арсеналу мовы тыя сродкі, неабходнасць ужывання якіх абумоўлена пэўнымі экстралінгвістычнымі фактарамі.